Полацкай зямлі і ў іншых рэгіёнах. Так, І. А. Жукаў (Расія) паведаміў пра пячаткі віцебскай княгіні Сафіі, а І. М. Шталянкоў (Беларусь) – пра выяўленне вялікай колькасці пячатак у Аршанскім раёне. Гісторыя сфрагістычнай калекцыі Нацыянальнага музея Літвы была асветлена ў выступленні В. Алексеюнаса (Літва).

Два выступленні былі прысвечаны геральдыцы. Так, С. М. Цемушаў (Беларусь) выказаў сваё меркаванне аб прызначэнні так званых «геральдычных» падвесак, якія былі распаўсюджаны на землях Старажытнай Русі ў X–XI стст. Аб сучасным стане і перспектывах развіцця тэрытарыяльнай геральдыкі Беларусі распавяла М. М. Елінская (Дэпартамент па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь).

Пра вельмі цікавую для беларускай фалерыстыкі знаходку ў Асобым архіве Літвы паведаміла Д. Грымалаўскайтэ (Нацыянальны музей Літвы). Там захоўваецца ўнікальны крыж Заслугі – узнагарода Беларускай цэнтральнай рады для настаўнікаў Віленскай беларускай гімназіі.

Такім чынам, можна канстатаваць, што Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара БДУ Валянціна Навумавіча Рабцэвіча прайшлі на высокім прафесійным узроўні. Шырокае геаграфічнае прадстаўніцтва ўдзельнікаў, разнастайная тэматыка і навуковая значнасць іх паведамленняў, а таксама вострыя дыскусіі падчас пасяджэнняў набліжаюць канферэнцыі гістарычнага факультэта БДУ да самых прэстыжных нумізматычных навуковых форумаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Мы маем усе падставы меркаваць, што наступныя чытанні памяці Валянціна Навумавіча Рабцэвіча, правядзенне якіх запланавана на 2022 г., будуць яшчэ больш цікавымі і прадстаўнічымі.

***В. М. Сідаровіч***[2]

# КРУГЛЫЙ СТОЛ «ОТ УРБАНИСТИКИ ДО ВООРУЖЕНИЯ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО»

# КРУГЛЫ СТОЛ «АД УРБАНІСТЫКІ ДА ЎЗБРАЕННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА»

# ROUND TABLE «FROM URBAN STUDIES TO THE ARMING OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA»

Чалавек у праяўленні індывідуальнай і калектыўнай памяці імкнецца да абсалютызацыі знакавых падзей і дат, абагульняе іх у эмацыйна значныя ўспаміны і ідэнтычнасці. Карпаратыўная ж памяць аперыруе знакавасцю асобы і фарміраваннем мадэляў паводзін унутры гэтай карпарацыі. Універсітэт – гэта супольнасць вучняў і настаўнікаў, павага да асобы Мэтра і выхаванне новай генерацыі.

У аўдыторыі імя Уладзіміра Іванавіча Пічэты гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 12 красавіка 2018 г. на круглым стале «Ад урбаністыкі да ўзбраення Вялікага Княства Літоўскага» калегі, вучні і студэнты ўшанавалі памяць сябра і настаўніка, даследчыка і калегі Юрыя Мікалаевіча Бохана, заўчасна памерлага 13 красавіка 2017 г.

Юрый Мікалаевіч нарадзіўся 21 лютага 1966 г. у Мінску. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. А. Горкага (цяпер – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка) і аспірантуру Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Кандыдацкую дысертацыю па археалогіі абараніў у 1994 г. Доктарам гістарычных навук стаў у 37 год (2003 г.). Кіраваў аддзелам гісторыі Беларусі XIII–XVIII стст. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і кафедрай эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Сябра навуковых і экс-

[2]*Виталий Михайлович Сидорович* – заведующий учебной лабораторией музейного дела исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Міхайлавіч Сідаровіч* – загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vital M. Sidarovich*, the head of training laboratory of museum business, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *wital.sidarowicz@gmail.com*

пертных саветаў, рэдкалегій навуковых выданняў з 2004 г.

Больш за 20 год Юрый Мікалаевіч аддаў выкладанню на гістарычным факультэце БДУ, на кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ. У аснову сваіх спецкурсаў ён закладаў практычны вопыт уласных даследаванняў урбаністыкі, узбраення і вайсковай справы Вялікага Княства Літоўскага. Узгадваецца, як падчас лекцый актыўна маляваў крэйдай і алоўкам, што часам замяняла візуальную прэзентацыю. Навуковыя і навукова-папулярныя выданні даследчыка ўвасобілі ўвесь спектр цікавасці аўтара да рэканструявання сярэднявечнага мінулага Беларусі. Як навуковы кіраўнік і кансультант Юрый Мікалаевіч падрыхтаваў спецыялістаў у галіне даследавання ўзбраення і вайсковай справы. Кола яго вучняў не можа быць абмежавана толькі дыпломнікамі, магістрантамі і аспірантамі: вучоны нікому не адмаўляў у парадах і дапамозе.

Фармат круглага стала прадугледжваў тры блокі. Арганізатары хацелі ўзгадаць Юрыя Мікалаевіча як навукоўца, як навуковага кіраўніка і чалавека, як асобу, якая магла паўплываць на навакольных і навучыць іх.

З уступным словам на пачатку мерапрыемства выступіў дэкан гістарычнага факультэта БДУ, прафесар А. Г. Каханоўскі. Ён закрануў пытанні фарміравання цэлага напрамку ў даследаваннях універсітэта (гісторыя Вялікага Княства Літоўскага), якi развівалі ў 1990–2000 гг. менавіта прадстаўнікі новага пакалення даследчыкаў (П. А. Лойка, У. П. Емельянчык і, канешне, Ю. М. Бохан). Адзначыў Аляксандр Генадзевіч і ролю прыватных архіваў даследчыкаў у вывучэнні і развіцці гісторыі сярэднявечнай Беларусі ва ўніверсітэце, а таксама неабходнасць стварэння ўмоў для яе развіцця.

Пра Ю. М. Бохана як навукоўца, выкладчыка і функцыянера вышэйшай школы расказалі ў сваіх выступленнях загадчык цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, прафесар В. Ф. Голубеў і загадчыца кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, дацэнт Н. І. Палетаева. Працу вучонага ў экспертным савеце ВАК Беларусі і яго ролю ў падрыхтоўцы кадраў вышэйшай катэгорыі адзначыў загадчык кафедры гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ, прафесар В. А. Фядосік. Археаграфічны аспект навуковай дзейнасці Юрыя Мікалаевіча і яго працу ў «Архіварыусе» акрэсліў загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ М. Ф. Шумейка. Пра традыцыі факультэта і месца ў ім Юрыя Мікалаевіча ў іх стварэнні расказалі загадчык кафедры гісторыі Расіі, прафесар А. А. Яноўскі і дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Ю. Л. Казакоў.

Затым слова было прадстаўлена вучням Юрыя Мікалаевіча. Намеснік дырэктара Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» па выставачных праектах і гісторыка-культурнай спадчыне С. А. Егарэйчанка выступіў з паведамленнем «Вяртаючы з небыцця. Уклад Ю. М. Бохана ў вывучэнне калекцыі зброі і даспехаў нясвіжскіх Радзівілаў», у якім распавёў пра планы супрацоўніцтва з Ю. М. Боханам па апісанні і рэпрэзентацыі радзівілаўскай мілітарнай спадчыны ў Беларусі. На жаль, плённае навуковае супрацоўніцтва перарвалася, падрыхтоўка новага пакалення спецыялістаў не завершана, а вырашэнне некаторых пытанняў без дапамогі мэтра зойме больш часу. Навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і ранняга Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. А. Волкаў у сваім паведамленні «Публікацыя спадчыны Юрыя Мікалаевіча Бохана» расказаў пра рыхтуемы сумесна з сям'ёй Боханаў праект выдання работ Юрыя Мікалаевіча, прысвечаных урбаністыцы Беларусі, у аснову якога будзе пакладзена кандыдацкая дысертацыя даследчыка, яго асобныя друкаваныя тэксты па згаданай праблеме. Увага чытачоў будзе звернута на іканаграфію, ілюстрацыйны і картаграфічны матэрыял.

Нарэшце, пра чалавечы аспект асобы Ю. М. Бохана, яго сціпласць і адначасова прынцыповасць згадалі А. А. Радаман, М. Н. Гальпяровіч, В. А. Варонін і У. А. Падалінскі.

На мерапрыемстве прысутнічалі студэнты розных курсаў, магістранты і аспіранты БДУ. Менавіта да іх у заключным слове звярнулася прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў А. С. Бохан. Згадаўшы жыццёвую пазіцыю Юрыя Мікалаевіча, яна параіла прысутным заставацца сабой.

Мерапрыемствы падобнага кшталту ствараюць прастору Універсітэта. Антрапалогія навукі пачынаецца з выбудовы сваіх сувязяў з папярэдняга пакалення (настаўнікаў) і наступнага пакалення (вучняў), фарміруюць карпаратыўную культуру з акцэнтам на шанаванні традыцый і права дыскусіі.

***А. У. Любы***[1]

[1]*Андрей Владимирович Любый* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Андрэй Уладзіміравіч Любы* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Andrei V. Liuby*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of Ancient time and Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *liuby@bsu.by*